ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

ОРГАН КОСАЎСКАГА РК КП(б) БЕЛАРУСІ
І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 6 (26) Пятніца 23 лютага 1945 г.

**Мы армію нашу расцілі ў змаганні!**

**Захопнікаў подлых з дарогі зьмяцем!**

**Мы лёс пакаленняў рашаем баямі,**

**Да славы Радзіму сваю павядзем!**

## ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ РАСЛА І ЎМАЦОЎВАЛАСЯ Ў БАРАЦЬБЕ З ІНТЭРВЕНТАМІ

Не ўпершыню Чырвонай Арміі прыходзіцца абараняць нашу радзіму ад нападу ворагаў. Чырвоная Армія была створана для барацьбы з войскамі іншаземных інтэрвентаў-захопнікаў, якія імкнуліся расчляніць нашу краіну і знішчыць яе незалежнасць. Маладыя атрады Чырвонай Арміі, упершыню ўступіўшыя ў вайну, нагалаву разбілі нямецкіх захопнікаў пад Псковам і Нарвай 23 лютага 1918 года. Іменна таму дзень 23 лютага 1918 г. быў аб'яўлен днём нараджэння Чырвонай Арміі. З таго часу Чырвоная Армія расла і ўмацоўвалася ў барацьбе з іншаземнымі інтэрвентамі-захопнікамі. Яна адстаяла нашу радзіму ў баях з нямецкімі захопнікамі ў 1918 годзе, выгнаўшы іх за межы Украіны, Беларусі. Яна адстаяла нашу радзіму ў баях з іншаземнымі войскамі Антанты ў 1919—1921 гг., выгнаўшы іх за межы нашай краіны.

Фашысцкая Германія вераломна напала на нашу краіну, груба і подла нарушыўшы дагавор аб ненападзе. Вораг лічыў, што пасля першага-ж удару Чырвоная Армія будзе разбіта і страціць здольнасць супраціўлення. Але вораг жорстка пралічыўся. Ён не ўлічыў сілы Чырвонай Арміі, не ўлічыў трываласці совецкага тыла, не ўлічыў волі народаў нашай краіны да перамогі, не ўлічыў ненадзейнасці еўрапейскага тыла фашысцкай Германіі, не ўлічыў, урэшце, унутранай слабасці фашысцкай Германіі і яе арміі.

У першыя месяцы вайны з прычыны нечаканасці і раптоўнасці нямецка-фашысцкага нападу Чырвоная Армія аказалася вымушанай адступаць, пакінуць частку совецкай тэрыторыі. Але адступаючы, яна знясільвала ворага, наносіла яму жорсткія ўдары. Ні байцы Чырвонай Арміі, ні народы нашай краіны не сумняваліся, што гэты адыход з'яўляецца часовым, што вораг будзе астаноўлен, а затым і разбіт.

У ходзе вайны Чырвоная Армія папаўнялася новымі жыццёвымі сіламі, папаўнялася людзьмі і тэхнікай, атрымоўвала на дапамогу новыя рэзервныя дывізіі. І настаў час, калі Чырвоная Армія атрымала магчымасць перайсці ў наступленне.

(З загада Народнага Камісара Абароны І. В. Сталіна 23 лютага 1942 года № 55.)

## Урачыстае паседжанне, прысвечанае 27-й гадавіне Чырвонай Арміі

22 лютага ў 8 гадзін вечара ў памяшканні гарадскога клуба адбылося ўрачыстае паседжанне гарадскога Совета дэпутатаў працоўных разам з прадстаўнікамі партыйных, комсамольскіх і грамадскіх арганізацый, прысвечанае 27-й гадавіне Чырвонай Арміі.

Даклад аб 27-й гадавіне РСЧА зрабіў райваенком т. Жаркіх.

Пасля даклада была паказана мастацкая самадзейнасць вучняў косаўскай сярэдняй школы.

* * *

Урачыстыя паседжанні аб 27-й гадавіне Чырвонай арміі адбыліся ва ўсіх сельсоветах раёна.

## Слава нашай Арміі!

**Сердце республика с армией слила.**
**Нету на свете крепче сплава.**
**Красная Армия — наша сила,**
**Нашей Красной Армии — Слава!**

Чырвоная Армія і совецкі народ—гэта адзіны магутны кулак, які разбіў адборныя полчышчы гітлераўскіх галаварэзаў, нанёс фашысцкай германіі страшныя паражэнні.

Наша армія заўсёды карысталася падтрымкай і любоў'ю з боку ўсяго совецкага народа. І зараз у дні Вялікай Айчыннай вайны наш народ аддае ўсе сілы на дапамогу арміі.

Совецкі народ любіць сваю армію, акружае яе клопатамі і ўвагай, забяспечвае яе ўсім неабходным. Пра гераічныя подвігі нашых байцоў і афіцэраў складзена многа цудоўных песень.

Пры падтрымцы ўсяго совецкага народа, пад кіраўніцтвам вялікага палкаводца сучаснасці т. Сталіна Чырвоная Армія ачысціла нашу зямлю ад фашысцкай погані і зараз бязлітасна громіць параненага фашысцкага звера ў яго ўласным логаве.

Няхай жыве пераможная Чырвоная Армія, армія-вызваліцельніца, якая выгнала нямецка-фашысцкіх захопнікаў з совецкай зямлі і громіць гітлераўскія войскі на тэрыторыі Германіі!

# Першая раённая комсамольская канферэнцыя

18 і 19 лютага гэтага года ў Косаве ў памяшканні гарадскога клуба адбылася першая раённая комсамольская канферэнцыя. На канферэнцыі прысутнічала 65 дэлегатаў з рэшаючым голасам.

Пад бурныя апладысменты прысутных у ганаровы прэзідыум выбіраюцца члены палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з т. СТАЛІНЫМ.

Канферэнцыя паслала прывітальныя тэлеграмы таварышу СТАЛІНУ і Цэнтральнаму Камітэту КП(б) Беларусі.

Канферэнцыя заслухала адчотны даклад сакратара РК ЛКСМ Беларусі т. Савіна аб выніках работы комсамольскай арганізацыі раёна за адчотны перыяд.

— Комсамольская арганізацыя нашага раёна, — гаворыць т. Савін прарабіла значную работу ў справе мабілізацыі несаюзнай моладзі на выкананне ўсіх задач, якія ставяць партыя і ўрад перад комсамолам. У перыяд нямецкай акупацыі комсамольцы і перадавая несаюзная моладзь ішлі ў першых радах барацьбітоў супроць ненавісных акупантаў за чэсць і незалежнасць нашай радзімы. Звыш 1000 чалавек моладзі нашага раёна сярод якіх было 400 комсамольцаў з'яўляліся байцамі партызанскіх атрадаў, бязлітасна помсцілі ворагу за яго крывавыя здзекі над нашым народам. 33 падпольныя комсамольскія арганізацыі аказвалі партызанскім атрадам неацэнімую паслугу разведкай і зборам неабходных матэрыялаў аб праціўніку.

—Гераічная Чырвоная Армія, — гаворыць далей дакладчык — вызваліла наш раён з фашысцкага ярма. З першых-жа дзён комсамольцы ўзяліся за аднаўленне разбуранай народнай гаспадаркі, мабілізуючы на гэту агульнанародную справу ўсю несаюзную моладзь. Комсамольцы і моладзь з'явіліся ініцыятарамі рамонта дарог і мастоў, аднаўлення школ і хат-чытален. Пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі комсамольцы актыўна удзельнічалі ва ўсіх праводзімых мерапрыемствах.

—Аднак, — падкрэсліў т. Савін — на раду з поспехамі комсамольская арганізацыя раёна мела ў сваёй рабоце рад істотных недахопаў. Мала мы працавалі сярод несаюзнай моладзі, недастаткова праводзілі з ёй гутарак і дакладаў палітыка-выхаваўчага характара. Толькі гэтым можна вытлумачыць марудны рост комсамольскай арганізацыі за кошт перадавой несаюзнай моладзі. У нас ёсць вялікая база для роста комсамольскіх арганізацый — каля 4-х тысяч моладзі. Трэба больш працаваць з гэтай моладзью, акунуцца ў яе асяроддзе, павесці яе за сабой. У гэтым рашаючую ролю павінны адыграць нашы хаты-чытальні, якія на жаль да гэтага часу не сталі цэнтрамі паліт-масавай работы сярод моладзі на сяле. Нам неабходна рашуча палепшыць работу групы дакладчыкаў райкома комсамола і прапагандысцкіх груп кожнай пярвічнай комсамольскай арганізацыі. Мы павінны даць для нашай моладзі максімальную колькасць лекцый і дакладаў на розныя тэмы.

У заключэнне т. Савін указаў на неабходнасць яшчэ вышэй падняць палітычную актыўнасць комсамольцаў у выкананні ўсіх задач, якія стаяць перад раёнам.

У спрэчках па адчотнаму дакладу РК ЛКСМ Беларусі выступіла 19 дэлегатаў.

Выступаючыя ў спрэчках дэлегаты расказалі аб сваёй рабоце і крытыкавалі райком комсамола за недастатковую дапамогу пярвічным комсамольскім арганізацыям у справе арганізацыі гурткоў мастацкай самадзейнасці і вучобы комсамольскага актыва. Райком комсамола і РайАНА выпусцілі з-пад увагі арганізацыю вячэрніх школ для рабочай і сялянскай моладзі. Сярод комсамольцаў і моладзі адсутнічае ваенная і спартыўная работа.

У сваім выступленні сакратар РК КП(б) Беларусі т. Юшкевіч адзначыў, што комсамол нашай краіны пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі заслужыў вялікае прызнанне ўсяго народа. Комсамол, заснаваны вялікім Леніным, горда прынёс свае баявыя сцягі, змагаючыся за совецкую радзіму. Тав. Юшкевіч указаў на вялікую работу, праробленую комсамольцамі раёна і заклікаў комсамольцаў працаваць яшчэ лепш, аддаць усе сілы на хутчэйшы разгром ворага.

Сакратар Брэсцкага абкома ЛКСМ Беларусі т. Шумілін указаў на недастатковую сувязь комсамольскіх арганізацый з масамі несаюзнай моладзі, на недастатковую работу сярод школьнікаў, у выніку чаго піонеры і школьнікі мала знаюць аб героях комсамольцах.

—Задача сельскіх комсамольскіх арганізацый, — заканчвае т. Шумілін, — усямерна паднімаць аўтарытэт сельсовета, дапамагаць сельсовету ў выкананні ўсіх дзяржаўных задач. Комсамольцы павінны павышаць аўтарытэт сваёй арганізацыі. Кожны комсамолец павінен быць сельскім агітатарам, служыць прыкладам у паводзінах, быту, нястомна вучыцца і вучыць другіх.

У прынятай рэзалюцыі па адчоту РК ЛКСМ Беларусі канферэнцыя прызнала работу райкома комсамола здавальняючай і намеціла канкрэтныя мерапрыемствы для ліквідацыі ўсіх недахопаў, якія мелі месца ў рабоце комсамольскай арганізацыі раёна да гэтага часу.

Закрытым тайным галасаваннем канферэнцыя выбрала пленум РК ЛКСМ Беларусі ў складзе 23 членаў і 5 кандыдатаў і рэвізійную камісію ў складзе 5 чалавек.

## Першае паседжанне пленума Косаўскага РК ЛКСМ Беларусі

20 лютага адбылося першае паседжанне пленума райкома комсамола.

Пленум выбраў бюро РК ЛКСМБ з 7 чалавек. Членамі бюро выбраны: ЮШКЕВІЧ П. М., РУДОЙ А. П., САВІН Ф. І., РУДЗЬКО А. Н., КОРШУНАВА А. Я., ШЧЭГЛОВА К. І., МІХАЙЛАЎ К. І.

Першым сакратаром РК ЛКСМ Беларусі пленум выбраў тав. САВІНА ФЕДАРА ІВАНАВІЧА другім — КОРШУНАВУ АНТАНІНУ ЯГОРАЎНУ. Загадчыкам учоту райкома — ШЧЭГЛОВУ КЛАЎДЗІЮ ІОСІФАЎНУ.

Адказны рэдактар А. П. Рудой.

Адрас рэдакцыі: Косаў, вул. Максіма Горкага 106.